# ТЕОРИЯ И ИСТОРИЯ ГОСУДАРСТВА И ПРАВА

**УДК 340.12**

## ЭРОЗІЯ ДЗЯРЖАЎНАГА СУВЕРЭНІТЭТУ: ГІСТАРЫЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ ЯГО ПАНЯЦЦЯ І ЗМЕСТУ

***канд. юрыд. навук, дац. Д.В. ШЧЭРБІК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Даследуецца гістарычнае развіццё канцэпцыі дзяржаўнага суверэнітэту. Выяўляюцца паралелі ў разуменні суверэнітэту Бога і дзяржавы. У публікацыі разглядаецца працэс секулярызацыі суверэнітэту, замацаванне яго за «зямнымі» носьбітамі, які распачаўся ў эпоху Сярэднявечча. Апісваецца эвалюцыя «зямных» мэт суверэнітэту ў часы ад Сярэднявечча да Новага часу, паступавая дэмакратызацыя яго суб'екта-носьбіта. Выяўленая парадыгма развіцця катэгорыі дзяржаўнага суверэнітэту звязваецца з сучаснымі праблемамі і пагрозамі, што стаяць перад яго разуменнем і рэалізацыяй.*

«Усе дакладныя паняцці сучаснага вучэння аб дзяржаве ўяўляюць сабой секулярызаваныя тэалагічныя паняцці»

(*К. Шмітт «Палітычная тэалогія»*) [20, с. 57].

**Уводзіны.** «Рэспубліка Беларусь валодае вяршэнствам і паўнатой улады на сваёй тэрыторыі, самастойна ажыццяўляе ўнутраную і знешнюю палітыку» (ч. 1 арт. 1) [8, с. 4]. Падобную норму, што абвяшчае дзяржаўны суверэнітэт, змяшчае большасць сучасных канстытуцый (напрыклад, Італіі, Францыі, Грэцыі і інш.), і, акрамя таго, яны дадаткова ўказваюць на народ як крыніцу ўлады [10, с. 243; 12, с. 363; 14, с. 105]. Так, частка 2 артыкула 1 Канстытуцыі Іспаніі 1978 года абвяшчае: «Носьбітам нацыянальнага суверэнітэту з'яўляецца іспанскі народ, крыніца дзяржаўнай улады» [11, с. 298]. Падобнае палажэнне змяшчаецца і ў частцы 2 артыкула 20 Асноўнага закона ФРГ 1949 года: «Уся дзяржаўная ўлада зыходзіць ад народа...» [13, с. 162].

На міжнародным узроўні артыкул 2 Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый абвяшчае як прынцыпы міжнароднага права суверэнную роўнасць дзяржаў, іх палітычную незалежнасць, тэрытарыяльную недатыкальнасць, неўмяшанне ва ўнутраную кампетэнцыю дзяржаў [18].

Аднак, нягледзячы на паўсюднае прызнанне і юрыдычнае замацаванне суверэнітэту дзяржаў, менавіта сучаснасць у найвялікшай ступені ставіць яго пад сумнеў. Па меркаванні шматлікіх спецыялістаў у вобласці міжнароднага права, прыйшоў час адмовіцца ад традыцыйнага яго разумення: «галоўная задача філасофіі права і міжнароднага права – усімі сродкамі змагацца супраць старога табу на абсалютны суверэнітэт, [які] перашкаджае ўсякаму рашучаму працэсу па шляху агульнай інтэграцыі..» [6, с. 174]. Яны ўказваюць, што суверэнітэт прадугледжвае толькі незалежнасць ад іншых дзяржаў, але «ў рамках міжнароднага права» [7].

Відавочна, што асноўная пагроза ідэі дзяржаўнага суверэнітэту зыходзіць ад сучасных інтэграцыйных працэсаў, якія пераносяць цэнтр прыняцця рашэнняў і заканатворчасці з нацыянальных органаў улады на наднацыянальныя ці міжнародныя, і з боку ідэалогіі правоў чалавека, якая ставіць сябе вышэй дзяржаўных межаў і прадугледжвае міжнароднае ўздзеянне на дзяржавы ў выпадку парушэння імі прызнаных стандартаў у сферы абароны правоў чалавека.

**Асноўная частка.** Варта ўсё ж адзначыць, што эрозія сутнасці суверэнітэту пачалася значна раней і ляжыць у ідэйнай плоскасці. Упершыню згаданае ў XIII стагоддзі ў парыжскай Сарбоне паняцце суверэнітэту выступала адмаўленнем сярэднявечнага ўніверсалісцкага разумення свету, у адпаведнасці з якім уладаром Christianitas аб'яўляліся або Папа Рымскі, або Імператар Свяшчэннай Рымскай імперыі, а ўнутры каралеўстваў аўтаномію мелі саслоўі, карпарацыі і рэгіёны.

Фактычна сярэднявечным суверэнам, хоць гэтае слова і не ўжывалася, быў Хрыстос Уладар (Пантакратар). У сваім акружным пасланні, прысвечаным грамадскаму панаванню Хрыста, Папа Пій XI, праводзячы даследаванне вучэння царквы па дадзеным пытанні, прыводзіць словы св. Кірыла Александрыйскага: «Хрыстос, – кажа ён, – мае валадарства над усімі творамі: валадарства, ня сілай узятае і прысво-

енае, але па сутнасці і па прыродзе, якое Яму належыць» [15]. Вяршэнства Бога як заканадаўцы, суддзі і настаўніка ўспрымалася сярэднявечным грамадствам як не патрабуючае дадатковага тлумачэння. Увесь лад будаваўся на падмурку Яго Права і Яго Кіравання (*Su Ley y Su Gobierno*), і «ні водзін сярэднявечны ўладар нават не разважаў наконт неабходнасці фармальнага ўзнання свайго падданства да Каралеўства Хрыста, бо гэта было і так для яго відавочна» [1]. І хто б не прэтэндаваў на вяршэнства ў сярэднявечным грамадстве, Папа ці Імператар, гэта была барацьба за намесніцтва, за права весці людзей да «нябеснага шчасця». Пры гэтым зямны намеснік – гэта хутчэй ахоўнік, суддзя, чым законатворца. «Ніхто, ні імператар, ні іншы уладар, ні які-небудзь сход чыноў ці прадстаўнікоў зямлі, не выпрацоўвае новых законаў. Паколькі крыніцай права лічыўся Бог, то адсюль вынікала, што права не можа быць несправядлівым або дурным, яно – дабро, дабро па самой сваёй сутнасці» [4]. І гэтае права вечнае, бо і справядлівасць Бога мае вечны характар, а значыць нормы носяць звычаёвы характар. Яны адпавядаюць натуральнаму прававому парадку, што вынікае з волі Бога, і які закладзены ў розум і сумленне людзей. Права ў лепшым выпадку «адкрываюць», а потым забяспечваюць яго захаванне – мір і парадак (ordo i pax), тым самым накіроўваючы па Боскім і натуральным законам людзей да збаўлення. Таму для сучаснага юрыдычнага погляду парадаксальна, што разам ужываліся шматлікія палітычныя інстытуты (духовая і свецкая ўлады, правінцыйныя, гарадскія аўтаноміі, карпарацыі) і іх прававыя сістэмы.

Аднак ужо Грацыян паставіў пад сумненне звычаі, высоўваючы крытэрыямі іх дзейснасці разумнасць, усеагульнасць, працяжнасць у часе, адзінства прымянення [2, с. 148]. Кананісты, абвяшчаючы вяршэнства Боскага права над натуральным, і легісты, ідэалізуючы рымскае права, закладвалі патэнцыю змянення ролі ўладара, актывізацыю яго заканатворчых здольнасцей. Канчаткова новае разуменне дзяржавы дзякуючы М. Макіявелі і Ж. Бадэну запанавала ў эпоху Рэнесансу.

Легісты абвясцілі, што кароль – імператар у сваім каралеўстве (rex est imperator in regno suo). Яго воля і права аб’яўляліся вышэйшым прыярытэтам над правамі саслоўяў, карпарацый і правінцый, а таксама абвяшчалася яго незалежнасць ад універсалісцкіх утварэнняў. Дадзенае разуменне суверэнітэту, якое ў той час атаясамлівала манарха і дзяржаву, захавалася да цяперашняга часу: «незалежнасць дзяржавы ў міжнародных адносінах і тэрытарыяльнае вяршэнства ўнутры краіны» [9, с. 15]. Нават Бог не мог абмежаваць яго суверэнітэт, бо мэта дзяржавы становіцца цалкам асобной ад царквы, становіцца зямной. Так, паводле Дантэ, атрыбут чалавечага жыцця ёсць пазнанне і пашырэнне ведаў, а мэта дзяржавы – стварэнне для гэтага ўмоў усеагульнага міру [5, с. 27 – 28]. Іншыя аўтары традыцыйна ўжывалі тэрмін агульнага дабра [3]. Дадзены разрыў з трансцэндэнтнай мэтай існавання палітычнага арганізма ўжо закладваў тэарэтычную магчымасць канфлікту «агульнага дабра» і суверэнітэту, што як раз і актуальна для сучаснасці.

Канчатковую секулярызацыю суверэнітэту ажыццявіў Т. Гобс. Гэты працэс вобразна раскрыў знакаміты нямецкі прававед К. Шмітт у сваім разважанні над «Левіафанам» Гобса: «Жах перад натуральным станам збірае разам перапоўненых страхам індывідаў; іх страх абвастраецца да апошніх межаў; бліскае іскра Ratio – і вось перад намі новы Бог» [19, с. 147]. «Смяротны» Бог – дзяржава, рэпрэзентантам і ўвасабленнем якой з’яўляецца манарх. Першапачаткова дзяржава – іманентны бог, суверэн яе – Панкратар, уладар, заканадаўца і суддзя. Вызваліўшыся з-пад нябеснай апекі і атрымаўшы поўны суверэнітэт «зямны» Бог хутка вынішчае канкурэнтаў – ён знішчае саслоўныя ды тэрытарыяльныя аўтаноміі ў імя «паліцыі», грамадскага парадку. Такім чынам, зямны суверэнітэт абсалютнай манархіі зноў аказваецца звязаны мэтай свайго існавання.

Але паступова наступае «адчараванне» дзяржавы, бо калі сярэднявечная дзяржава нагадвала арганізм, што жыве паводле боскіх і натуральных законаў, то новая дзяржава – гэта машына, якая створаная людзьмі. «Унутраная логіка выпрацоўваемага людзьмі штучнага прадукту «дзяржава» вядзе да з’яўлення не асобы, а машыны» [19, с. 153]. А машыне патрэбны толькі картэзіянскі Бог – канстытуцыйны манарх, ці не патрэбны ніякі – рэспубліка. І гэты пераход ад манархіі да рэспублікі ў XIX – XX стагоддзях фактычна адлюстроўвае нарастанне «нейтральнасці» дзяржавы [21, с. 53]. Яна паступова становіцца механізмам, які прадукуе законы, але законы, не звязаныя нейкай звышмэтай, а абумоўленыя ўнутранымі прычынамі ці выпадковымі пажаданнямі секулярызаванага носьбіта суверэнітэту. Суверэнітэт, такім чынам, становіцца цалкам падпарадкаваным нават не нейкай звышмісіі, звышмэты, а выключна прыземленым матэрыяльным запатрабаванням.

І вось эпоха Асветы пераносіць вытокі суверэнітэту з манарха на народ, з чаго выцякала ідэя дэмакратыі як спосабу ажыццяўлення народам свайго суверэнітэту. Упершыню сфармуляванае Сыесам ліберальнае азначэнне народа: «супольнасць людзей, якія жывуць пад агульным законам і прадстаўленыя адной заканадаўчай установай» [17], – да цяперашняга часу стала пануючым. Яно яшчэ больш уступіла ў сутнасную супярэчнасць з паняццем суверэнітэту. У дадзеным выпадку дарэчы прывесці разважанні пра

межы дэмакратыі яркага прадстаўніка лібертарыянства М. Ротбарда: «Калі лічыць, што ў краіне *X* улада павінна прыналежаць большасці насельніцтва, можна з той жа абгрунтаванасцю запатрабаваць, каб і большасці нейкай вобласці ў краіне *X* было дадзена права прымаць рашэнні, у тым ліку і пра аддзяленне, і гэты працэс аддзялення можна працягнуць да ўзроўню асобнай вёскі, хаты і кожнага асобнага чалавека, так што дэмакратычнае кіраванне звядзецца да асабістага самакіравання… [таксама] нацыянал-дэмакрат можа вырашыць, што больш шматлікае насельніцтва суседняй краіны мае права большасцю галасоў далучыць яго краіну, і так датуль, пакуль мы не прыйдзем да сусветнага ўрада, які кіруецца сусветнай большасцю галасоў» [16]. Становіцца відавочным, што, разумеючы народ механістычна, толькі як добраахвотную і заснаваную на дамове супольнасць грамадзян, якая фарміруецца па шляху прадстаўлення або прыняцця грамадзянства, немагчыма рацыянальна растлумачыць існаванне дзяржаўнага суверэнітэту.

Негатыўныя наступствы падобнага падыходу ярка выяўляюцца ў сітуацыях навязвання непапулярных дзеянняў нацыянальным урадам з боку наднацыянальных арганізацый, напрыклад, у сферы фінансаў, сямейнай, рэлігійнай, культурнай палітыкі і г.д., а таксама ў практыцы міжнародных эканамічных санкцый ці ўзброеных інтэрвенцый пад лозунгам «абароны» правоў чалавека, калі тое ці іншае іх разуменне аб’яўляецца адзіна дакладным і агульнаабавязковым у сусветным маштабе. З другога боку, суверэнітэт паўсюдна ставіцца пад пытанне шматлікімі сепаратысцкімі рухамі, якія абапіраючыся на падтрымку геапалітычных вялікіх гульцоў, паспяхова, хоць часам і марудна, разбураюць межы дзяржаў (Рэспубліка Косава, Паўдневы Судан, Рэспубліка Паўдневая Асецiя і г.д.).

У зазаклэчэнне праведзенага даследавання, зробім наступныя **высновы:**

- вучэнне аб суверэнітэце прайшло доўгі шлях;

- секулярызаваны і перанесены з Бога на дзяржаву суверэнітэт адразу ж быў пастаўлены ў залежнасць ад мэты свайго існавання, існавання дзяржавы і прывязаны да характарыстык суб’екта-носьбіта;

- «адчараванне» дзяржавы і дэмакратызацыя крыніцы суверэннай улады фактычна пераўтварылі разуменне суверэнітэту ў ідэалагічную катэгорыю, якую кожны ў залежнасці ад вызнаваемых каштоўнасцей і палітычных магчымасцей напаўняе сваім зместам.

ЛІТАРАТУРА


1. Bartyzel, J. Społeczne Panowanie Chrystusa Króla w tradycyjnym nauczaniu Kościoła / J. Bartyzel [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.bibula.com/?p=58719. – Дата доступу: 15.09.2013.
2. Берман, Г.Дж. Западная традиция права: эпоха формирования/ Г.Дж. Берман; пер. с англ. – 2-е изд. – М.: Изд-во МГУ: Издат. гр. ИНФРА-М–НОРМА, 1998. – 624 с.
3. Боден, Ж. Шесть книг о государстве / Ж. Боден //Антология мировой политической мысли: в 5 т. Т. 2. – М., 1999. – С. 689 – 695 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.law.edu.ru/doc/ /document.asp?docID=1255930. – Дата доступа: 15.09.2013.
4. Гуревич, А.Я. Категории средневековой культуры / А.Я. Гуревич [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://justlife.narod.ru/gurevich/gurevich07.htm. – Дата доступа: 15.09.2013.
5. Данте, А. Монархия / А. Данте; пер. с итал. В.П. Зубова; комментарии И.Н. Голенищева-Кутузова. – М.: «КАНОН-пресс-Ц » – «Кучково поле», 1999. – 192 с.
6. Диас-Мелиан Де Ханиш, М.В. Основы и природа правовой интеграции / М.В. Диас-Мелиан Де Ханиш // Правоведение. – 2001. – № 6. – С. 173 – 178.
7. Зыбайло, А.И. К вопросу о соотношении международного и национального права (теоретические аспекты) / А.И. Зыбайло // Белорусский журнал международного права и международных отношений. – 1998. – № 3 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://evolutio.info/index.php?option=com_ content&task=view&id=144&Itemid=49. – Дата доступа: 15.09.2013.
8. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь = Конституция Республики Беларусь: [1994 г. (са змяненнямі і дапаўненнямі): прынята на рэспубліканскіх рэферэндумах 24 лістапада і 17 кастрычніка]. – Мінск: Беларусь, 2008. – 92, [3] с.
9. Клименко, Б.М. Суверенитет правового государства / Б.М. Клименко // Международное право. – М., 2000. – № 3. – С. 15 – 22.
10. Конституция Итальянской республики // Конституции зарубежных государств: учеб. пособие. – 2-е изд., испр. и доп. – М.: Изд-во БЕК, 1997. – С. 243 – 279.
11. Конституция Королевства Испании // Конституции зарубежных государств: учеб. пособие. – 2-е изд., испр. и доп. – М.: Изд-во БЕК, 1997. – С. 297 – 351.
12. Конституция Республики Греция // Конституции зарубежных государств: учеб. пособие. – 2-е изд., исправ. и доп. – М.: Изд-во БЕК, 1997. – С. 363 – 430.

13. Конституция Федеративной Республики Германия // Конституции зарубежных государств: учеб. пособие. – 2-е изд., испр. и доп. – М.: Изд-во БЕК, 1997.
14. Конституция Французской республики // Конституции зарубежных государств: учеб. пособие. – 2-е изд., испр. и доп. – М.: Изд-во БЕК, 1997. – С. 105 – 134.
15. Пий XI. Quas primas (Окружное послание о Торжестве Царствия Христова) / Пий XI [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.unavoce.ru/library/quas_primas.html. – Дата доступа: 15.09.2013.
16. Ротбард, М. Из кн. «Власть и рынок: государство и экономика» / М. Ротбард [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://antisocialist.ru/papers/rotbard.myurrey.demokratiya.htm. – Дата доступа: 15.09.2013.
17. Сийес, Э.-Ж. Что такое третье сословие? / Э.-Ж. Сийес [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://vive-liberta.narod.ru/biblio/QTE.htm. – Дата доступа: 15.09.2013.
18. Устав Организации Объединенных Наций // Организация Объединенных Наций [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.un.org/ru/documents/charter/index.shtml. – Дата доступа: 15.09.2013.
19. Шмитт, К. Левиафан в учении о государстве Томаса Гоббса / К. Шмитт; пер. с нем. Д.В. Кузницына. – СПб.: «Владимир Даль», 2006. – 300 с.
20. Шмитт, К. Политическая теология: сб. / К. Шмитт; пер. с нем.; заключ. ст. и сост. А. Филиппова. – М.: «КАНОН – Пресс-Ц», 2000. – 336 с.
21. Шмитт, К. Эпоха деполитизаций и нейтрализаций / К. Шмитт // Социологическое обозрение. – 2001. – № 2, Т. 1. – С. 47 – 56.

*Паступіў 27.09.2013*

## THE EROSION OF STATE SOVEREIGNTY: THE HISTORICAL DEVELOPMENT OF ITS CONCEPT AND CONTENT

***D. SHCHERBIK***

*This article examines the historical development of the concept of state sovereignty. Parallels are found in the understanding of God's sovereignty and the sovereignty of the state. The article deals with the process of secularization of sovereignty, which began in the Middle Ages. Describes the evolution of the "secular" goal of sovereignty at the time of the Middle Ages to modern times, the gradual democratization of the subject of sovereignty. Identified development paradigm of the category of state sovereignty associated with the modern challenges and threats faced by its understanding and implementation.*